# ІНКЛЮЗІЎНЫ АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЕКТ «СПАДЧЫНА» ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ НАВУЧЭНЦАЎ З АСАБЛІВЫМІ АДУКАЦЫЙНЫМІ ПАТРЭБАМІ І ІХ БАЦЬКОЎ ПРАЗ ВЫВУЧЭННЕ КУЛЬТУРНАЙ І ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

*Саўчык В.А., Шрэйдзер С.У.,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 16 г. Гродна»,*
*г. Гродна, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле паказаны магчымасці рэалізацыі інклюзіўнага праекта «Спадчына» ў адукацыйным працэсе для найбольш паспяховай інтэграцыі і сацыялізацыі навучэнцаў з парушэннем слыху, кампесаванага кахлеарным імплантам (слыхавым апаратам), аказанне дапамогі педагогам, якія працуюць з навучэнцамі гэтай катэгорыіі ў правядзенні і арганізацыі ўрокаў, карэкцыйных заняткаў, выхаваўчых мерапрыемстваў з выкарыстаннем распрацаванага матэрыялу ў рамках інклюзіўнага адукацыйнага праекта «Спадчына».

**Resume.** The article shows the possibilities of implementing an inclusive project "Heritage" in the educational process for the most successful integration and socialization of students with hearing impairment compensated by cochlear implants (hearing aids), assisting teachers who work with students in this category in conducting and organizing correctional classes, educational activities using the developed material in the framework of the inclusive educational project "Heritage".

**Ключавыя словы**: праект, інклюзія, кахлеарны імплант.

**Key words:** project, inclusion, cochlear implant.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Гродна» – адна са школ Беларусі, у якой рэалізуюцца прынцыпы інклюзіўнай адукацыі [1]. Ажыццяўленне інтэграванага навучання і выхавання ў агульнаадукацыйнай установе патрабуе стварэння асаблівых умоў для навучання, выхавання, развіцця і самарэалізацыі ўсіх навучэнцаў незалежна ад стану іх псіхафізічнага здароўя і арганізацыі іх сумеснай дзейнасці [2].

Улічваючы рэалізацыю мерапрыемстваў у рамках Года Малой Радзімы, Года гістарычнай памяці ў адукацыйным працэсе, педагогамі быў распрацаваны інклюзіўны адукацыйны праект «Спадчына», які накіраваны на сацыялізацыю навучэнцаў з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі і іх бацькоў праз вывучэнне гістарычнай і культурнай спадчыны Гродна і Гродзеншчыны.

Асноўную практычную накіраванасць работы бачым у тым, каб паказаць магчымасці выкарыстання даследніцкай і экскурсійнай дзейнасці для вырашэння наступных задач: пашырэнне раўнапраўных магчымасцяў навучэнцаў з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі і іх бацькоў ва ўмовах інклюзіўнага грамадства; далучэнне да вывучэння нацыянальных традыцый і рамёстваў; пашырэнне сацыяльных зносін з грамадствам.

На працягу трох гадоў у ДУА «Сярэдняя школа № 16 г. Гродна» рэалізоўваецца інклюзіўны адукацыйны праект «Спадчына». У рамках праектнай дзейнасці былі распрацаваны анкеты для выяўлення ўзроўню валодання звесткамі аб культурнай і гістарычнай спадчыне Гродзеншчыны, звесткамі пра народныя традыцыі і рамёствы. У 2019/2020 навучальным годзе ў анкетаванні прымалі ўдзел 20 навучэнцаў 3-6 класаў інтэграванага навучання і выхавання з парушэннямі слыху, кампенсаванага кахлеарным імплантам (слыхавым апаратам) і 20 навучэнцаў 3-6 класаў, якія не маюць парушэнняў псіхафізічнага развіцця. Параўнальны аналіз дзвюх груп паказаў, што навучэнцы, якія маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця, а менавіта, парушэнні слыху, у меншай ступені валодаюць звесткамі пра культурную і гістарычную спадчыну Гродзеншчыны, амаль не ведаюць народныя рамёствы, традыцыйныя святы і абрады рэгіёна, у якім пражываюць.

У ходзе мэтанакіраваныхназіранняў, анкетавання, гутарак даведаліся, што навучэнцы са слыхавой дэпрывацыяй значна складаней, чым іх аднагодкі без асаблівасцей псіхафізічнага развіцця, уступаюць у зносіны з людзьмі, якія не маюць парушэнняў слыху. Самі навучэнцы тлумачаць гэта тым, што ім цяжка ўступаць у зносіны з незнаёмымі людзьмі, так як яны баяцца, што іх не зразумеюць.

Вынікі анкетавання «Ці ведаеце вы гісторую і этна-культуру Гарадзеншчыны?» паказалі, што 78 % ўдзельнікаў анкеты не ведаюць рэгіянальных асаблівасцей гарадзенскай кухні, толькі 52 % назвалі вядомыя архітэктурныя помнікі Гарадзеншчыны, 51 % пералічылі народныя святы і традыцыі, распаўсюджаныя на Гарадзеншчыне, 39 % рэспандэнтаў ведаюць рэгіянальныя рамёствы, 61 % назвалі гістарычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Гарадзеншчыны, 80 % апытаных выказалі жаданне прыняць удзел у праекце «Спадчына».

У сувязі з атрыманымі звесткамі была створана ініцыятыўная творчая група педагогаў, бацькоў, па распрацоўцы інклюзіўнага адукацыйнага праекта.

Рэалізацыя інклюзіўнага адукацыйнага праекта «Спадчына» ажыццяўляецца па наступных накірунках:

«Згадкі з роднай хаткі». Задача – фарміраванне цікавасці да вывучэння беларускага фальклору, прывіццё любові да беларускай літаратуры, развіццё чытацкай актыўнасці;

«Чароўны свет народных лялек». Задача– фарміраванне цікавасці да беларускай культуры ў рамках знаёмства дзяцей з народнымі лялькамі-абярэгамі як сімваламі беларускага народа;

«Мая Гарадзеншчына». Задача – арганізацыя даследчай дзейнасці навучэнцаў і іх бацькоў па вывучэнню гістарычнай і культурнай спадчыны Гродзеншчыны, жыццёвага шляху знакамітых гарадзенцаў, знаёмства з артэфактамі горада Гродна;

«Турград». Задача – арганізацыя і правядзенне пешых вандровак і аўтобусных тураў, віртуальных экскурсій па гістарычных і адметных месцах горада Гродна і Гродзеншчыны;

«Па колу сонца». Задача – арганізацыя даследчай дзейнасці, знаёмства з традыцыйным ісвятамі і абрадамі Гродзеншчыны;

«Сустрэчы з народнымі майстрамі». Задача – далучэнне да традыцыйных народных мастацтваў, знаёмства з народнымі ўмельцамі, рамеснікамі, знакамітымі землякамі.

Рэалізацыя мерапрыемстваў праекта не магчыма без супрацоўніцтва з другімі арганізацыямі горада Гродна і Гродзеншчыны. Наладжана супрацоўніцтва са спецыялістамі Гродзенскага абласнога цэнтра турызму і краязнаўства, Цэнтра рамёстваў «Спадчына», выставачнага цэнтра «Фестывальны», абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, школьнага народнага мінералагічнага музея «Карат», бібліятэкамі г. Гродна, Домам-музеям Э.Ажэшка, Музеям пажарнай службы і іншымі ўстановамі культуры і дадатковай адукацыі

Інклюзіўны адукацыйны праект «Спадчына» рэалізуецца паэтапна. На падрыхтоўчым этапе арганізаваны бацькоўскія сходы, індывідуальныя гутаркі з навучэнцамі і бацькамі. Праведзены сустрэчы са спецыялістамі ўстаноў культуры і дадатковай адукацыі з мэтай правядзення сумесных мерапрыемстваў па сацыялізацыі вучняў з асаблівасцямі развіцця сродкамі вывучэння краязнаўчага матэрыялу, правядзенню экскурсій, майстар-класаў.

Рэалізацыя асноўнага этапу ажыццяўляецца згодна накірункам, прадугледжаных праектам. Так, на занятках па прыкладнай этнаграфіі «Чароўны свет народных лялек» кожны навучэнец распрацаваў уласную калекцыю народных лялек. Дзеці вывучылі гісторыю і магію лялек «Зернявушка», «Стаўбушка», «Багач», «Дзесяціручка» і інш, а таксама тэхналогію іх вырабу. Вынікам працы стаў каляндар народных лялек.

На матэрыяле беларускага фалькору навучэнцы з асаблівасцямі развіцця завучваюць і прагаворваюць хуткамоўкі, прыказкі і прымаўкі, словы герояў народных казак, практыкуюцца ў дакладным гукавымаўленні, адпрацоўваюць дыкцыю, а таксама вучацца дзейнічаць сумесна, далучаючыся да інсцэніровак адначасова або паслядоўна.

Навучэнцамі пад кіраўніцтвам педагогаў беларускай мовы і літаратуры рэалізаваны міні-праект «Беларускія закладкі» з сімваламі-малюнкамі беларускага арнаменту і радкамі з твораў беларускіх паэтаў. Пры рэалізацыі задач накірунка «Мая Гарадзеншчына» праведзены пешыя вандроўкі па гістарычных месцах горада Гродна «Слядамі старой віціны», «Гародня Антонія Тызенгауза», «Гродна Наполеона Орды» і інш.

Для навучэнцаў створаны ўмовы для правядзення даследванняў па тэмах «Вуліца, на якой я жыву», «Горад дзяцінства маіх бацькоў», «Дваравыя гульні нашых бабуль» і інш.

У школьным народным мінералагічным музеі «Карат» пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў арганізаваны даследванні па наступных тэмах: «Карысныя выкапні Гродзеншчыны», «Тайны камянёў горада». З мэтай даследвання макрасвету насякомых горада Гродна наладжана супрацоўніцтва з Андрэем Шапавалавым, аператарам Гродзенскага тэлебачання.

Пры рэалізацыі накірунка «Турград» арганізаваны і праведзены экскурсіі па маршрутах Гродна-Адэльск-Гродна, Гродна-застава імя Усова-Аўгустоўскі канал-Гродно, Гродна-Мураванка-Жалудок-Гродна, Гродна-Ліда-Гродна і інш. Навучэнцы робяць першыя ў спробы якасці экскурсаводаў. Расказваюць паданні, легенды, звязанныя з якім-небудзь геаграфічным аб’ектам, маленькія гісторыі пра архітэктурныя помнікі, гістарычныя падзеі і вядомых землякоў.

У сувязі са складанымі эпідэміялагічнымі абставінамі научэнцы пад кіраўніцтвам педагогаў удзельнічаюць у даследваннях і ставарюць віртуальныя экскурсіі і аўдыётуры. Навучэнцамі 5-8 класаў распрацаваны экскурсіі і аўдыётуры: «Старейшие предприятия Гродно» (https://clck.ru/eowCi); «Гродно Наполеона Орды» (https://izi.travel/ru/be51-grodno-napoleona-ordy/ru); «Пуцявінамі Максіма» (https://izi.travel/ru/f01d-pucyavinami-maksima/be).

Па выніках даследчых работ навучэнцы дэманструюць вынікі і створаныя віртуальныя аўдыятуры, сумесна з педагогам падводзяць вынікі. Так, на заключным этапе праекта «Гродна Напалеона Орды» навучэнцы ДзУА «Сярэдняя школа № 16 г. Гродна» правялі віктарыну і арганізавалі выставу малюнкаў «Архітэктурны воблік Гродна» [3]. Пасля заканчэння праекта «Пуцявінамі Максіма» навучэнцы і іх бацькі прынялі ўдзел у конкурсе чытальнікаў твораў Максіма Багдановіча і аўтарскіх твораў, прысвечаных прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта [4]. Сумесна з супрацоўнікамі Цэнтра народнай творчасці «Спадчына» распрацаваны і праведзены заняткі для дзяцей з асаблівасцямі развіцця і бацькоў па наступных тэмах: «Нараджэнне Хрыстова і Калядкі», «Святкуем Масленіцу», «Ільняны Спас».

Дзякуючы сустрэчам з народнымі майстрамі і рамеснікамі Гарадзеншчыны, навучэнцы з асаблівасцямі развіцця пазнаёміліся з прафесіямі рамеснікаў: ткача, вышывальшчыцы, майстра па валянню з поўсці, майстра па вырабу рэчаў з гліны, музыканта, майстра па вырабу народных музычных інструментаў. Для вучняў і іх бацькоў з мэтай знаёмства з рэгіянальнымі народнымі рамёствамі арганізаваны і праведзены экскурсіі ў Цэнтр народнай творчасці «Спадчына», Адэльскі дом народнай творчасці, абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. Народнымі майстрамі і рамеснікамі праведзены майстар-класы для вучняў і іх бацькоў «Жывы ланцуг традыцый». З дапамогай гарадзенскіх майстроў і рамеснікаў у школе арганізавана мерапрыемства «Горад майстроў», падчас якога навучэнцы, іх бацькі прынялі ўдзел у выставе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і майстар-класах. Вынікам вывучэння народных абрадаў, рамёстваў сталі распрацаваныя навучэнцамі 7-8 классаў інтэрактыўныя плакаты: «Топ 10 народных цудаў Гарадзеншчыны» (https://clck.ru/eowED); «Народныя рамёствы Панямоння» (https://clck.ru/eowEY).

У апошні час сярод навучэнцаў з асаблівасцямі развіцця асаблівую папулярнасць і зацікаўленасць выклікаюць настолкі. Гульні спрыяюць развіццю самастойнага мыслення, пашыраецца актыўны моўны слоўнік, развіваецца крытычнае мысленне, творчае ўяўленне, мова, навыкі працы ў камандзе. Падчас рэалізацыі інклюзіўнага адукацыйнага праекта

«Спадчына» навучэнцамі і педагогамі распрацаваны наступныя настолкі: «Каляндарныя святы», «Архітэктурныя помнікі Гарадзеншчыны», «Масленічная гульня «Кракадзіл», «Хто Я? (Знакамітыя гарадзенцы)» і інш.

Трэба адзначыць, што навучэнцы актыўна ўдзельнічаюць са сваімі напрацоўкамі ў розных абласных і рэспубліканскіх конкурсах, праектах і атрымліваюць высокія ўзнагароды.

Такім чынам, удзел у інклюзіўнгым адукацыйным праекце «Спадчына» дапамог вырашыць наступныя задачы:

- развіццё навыкаў узаемаадносін, умення працаваць у камандзе;
- развіццё ўмення самастойна планаваць сваю дзейнасць;
- развіццё творчых здольнасцей;
- развіццё ўмення ставіць перад сабой канкрэтныя мэты і задачы, дасягаць іх;
- развіццё здольнасці адэкватна ацэньваць дасягнуты рэзультат і даваць самаацэнку сваёй дзейнасці.

Як паказвае наш вопыт, інклюзіўныя адукацыйныя мерапрыемствы ў рамках рэалізацыі праекту «Спадчына» дапамагаюць навучэнцам са слыхавой дэпрывацыяй вырашыць шэраг адукацыйных і выхаваўчых задач, пашырыць магчымасці ўзаемадзеяння з аднагодкамі без асаблівасцяў псіхафізічнага развіцця.

У ходзе рэалізацыі інклюзіўнага адукацыйнага праекта «Спадчына» навучэнцы пазнаёміліся з гістарычнай і культурнай спадчынай Гродзеншчыны; вывучылі правілы наведвання музея, тэатра; пашырылі ўзаемаадносіны з новымі людзьмі; набылі навыкі моўных зносін і граматнай вуснай і пісьмовай мовы; актывізавалі актыўны і пасіўны слоўнік; сфарміравалі вербальныя дыялогавыя навыкі (звязна апісваюць звесткі з асабістага, сямейнага, грамадскага жыцця, задаюць пытанні з мэтай атрымання канкрэтнай інфармацыі, дзеляцца ўражаннямі з субяседнікамі, размаўляюць на розныя тэмы, а таксама падтрымліваюць дыялог); набылі навыкі даследчай дзейнасці.

Вопыт па рэалізацыі інклюзіўнага адукацыйнага праекта абагульнены, трансліраваўся на паседжаннях метадычных аб'яднанняў школы і раёна, на канферэнцыях рознага ўзроўню. Дадзены вопыт рэкамендаваны для выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці настаўнікам-прадменікам, класным кіраўнікам.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Савчик, О. А., Проектная деятельность педагога общеобразовательного учреждения как средство профессиональной самореализации [Электронный ресурс] / О. А. Савчик, С. В. Шрейдер // Компетенции педагога XXI века: сб. материалов респ. конф. (Минск, 25 ноябр. 2021 г.) / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Беларус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2021. – С. 431–435.
2. Савчик, О. А. Профессиональная самореализация педагога посредством проектной деятельности / О. А. Савчик, С. В. Шрейдер // Самореализация педагога в условиях единого образовательно-профессионального пространства : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 27 апреля 2021 г. / редкол.: С.А. Сергейко [и др.]. – Гродно : ГУО «Гродненский областной институт развития образования», 2021. – С. 127–130
3. Шрейдер, С. В. Виртуальные аудиотуры как средство развития исследовательских навыков обучающихся во внеурочной деятельности [Электронный ресурс] / С. В. Шрейдер // Дидактика сетевого урока: материалы IV Междунар. науч.-практ. онлайн-конфер., г. Минск, 2–3 декабря 2021 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: О. А. Минич [и др.]. – Минск : БГПУ, 2022 – С. 483–486.
4. Шрейдер, С. В. Организация исследовательской деятельности учащихся на основе технологии цифрового сторителлинга / С. В. Шрейдер // Адукацыя і выхаванне. – 2020. – № 5. – С. 34–41.